Аляксандр Дубко – чалавек-легенда / падрыхт. С. Ермалаеў // Герой працы (Шуміліна). – 2023. – 10 студз. – С. 4.

**Аляксандр Дубко – чалавек-легенда**

***14 студзеня спаўняецца 85 год з дня нараджэння Героя Беларусі, Героя Сацыялістычнай Працы Аляксандра Іосіфавіча ДУБКО, ураджэнца Шумілінскага раёна***

Сваім настаўнікам яго называлі многія вядомыя кіраўнікі рознага рангу. Сакрэты яго гаспадарчага таленту запатрабаваныя і сёння. Аляксандр Дубко ўваходзіць у эліту старшынскага корпусу Беларусі. Узначальваючы калгас «Прагрэс» Гродзенскага раёна, ён вывеў яго на «касмічную арбіту». Пазней эфектыўна кіраваў вобласцю. Яго ведалі, любілі і паважалі не толькі на Гродзеншчыне, але і па ўсёй краіне.

Аляксандр Дубко нарадзіўся ў вёсцы Ілава Шумілінскага (на той час Сіроцінскага) раёна. Бацька памёр, калі Аляксандру было два месяцы. А праз два гады грымнула вайна. Пасля былі цяжкія пасляваенныя гады. Хлопчык пасталеў, так і не пабачыўшы шчаслівага дзяцінства. Пасля заканчэння школы ён паступіў у Гродзенскі сельскагаспадарчы інстытут (зараз – аграрны ўніверсітэт). З гэтага моманту з Гродзеншчынай звязана ўсё жыццё Аляксандра Дубко. Падчас вучобы ў інстытуце праявіліся лідарскія якасці Аляксандра. Прычым найперш у спорце: Дубко быў выдатным баскетбалістам. Гэта адыграла сваю ролю падчас размеркавання. Каб захаваць спартсмена ў інстытуцкай камандзе, у 1960 годзе яго размеркавалі ў Гродзенскі раён у вучгас «Станіслалова». Тут малады спецыяліст шэсць год набіраўся вопыту на розных пасадах, у 1963 годзе ўзначаліў вучгас.

**Каханне на ўсё жыццё**

Са сваёй будучай жонкай Аляксандр пазнаёміўся падчас вучобы. Прыгажуня першакурсніца Эма Мялешчанка прыцягнула ўвагу Аляксандра, які быў на чацвёртым курсе. Пазнаёміліся на інстытуцкай спартакіядзе, дзе абодва гулялі ў баскетбольных камандах за свае курсы. Праз два гады пажаніліся. Нарадзілі і вырасцілі дваіх сыноў – Аляксандра і Уладзіміра, якія пайшлі па бацькоўскіх слядах, сталі аграномамі і працавалі ў аграпрамысловым комплексе краіны. Сёння ўжо выраслі ўнукі, падрастаюць праўнукі.



***Узнагароды А. І. Дубко: званне «Герой Беларусі» (медаль Героя Беларусі, 2001); званне «Герой Сацыялістычнай Працы» (залаты медаль «Серп і Молат», 1982); ордэн Айчыны III ступені (1997); 2 ордэны Леніна (1978, 1982); ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга (1973); ордэн «Знак Пашаны» (1971); медалі: «За працоўную доблесць» (1966) і іншыя.***

**Малады, перспектыўны**

Кіраўніцтва вобласці заўважыла маладога кіраўніка вучгасу. У 1966 годзе Аляксандру Дубко прапанавалі пасаду начальніка БерастАвіцкага раённага ўпраўлення сельскай гаспадаркі. Ён хутка ўвайшоў у курс спраў. Вучыўся сам, вучыў людзей лічыць капейку. Адзін за адным калгасы пазбаўляліся ад даўгоў. За чатыры гады ў раёне на трэць вырасла ўраджайнасць зерневых, бульбы, цукровых буракоў.

У 1970 годзе Аляксандру Іосіфавічу прапанавалі пасаду дырэктара спецыялізаванага трэста малочна-агародніннных саўгасаў Гродзенскай вобласці. Два гады ён кіраваў трэстам. І тут нечаканая прапанова першага сакратара Гродзенскага райкама партыі Антаніны Беляковай узначаліць лепшы ў раёне калгас «Прагрэс» у Верцялішках.

У тыя гады «Прагрэс» звязаны з імем легендарнага старшыні Фёдара Сянько, які ўзначальваў гаспадарку з 1959 да 1972 года, а ў 1971 стаў Героем Сацыялістычнай Працы і лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі СССР за будаўніцтва новага віду калгаснай сядзібы катэджнага тыпу з поўным пакетам сацыяльнай інфраструктуры. Фёдар Сянько стаў першым намеснікам старшыні Гродзенскага аблвыканкама і падтрымаў кандыдатуру Аляксандра Дубко на месца старшыні калгаса «Прагрэс».

**Высокая мэта – высокі вынік**

Планы новага старшыні былі амбіцыйныя. «Трэба развівацца, узбуйняцца, будавацца, ужываць новыя тэхналогіі», – паставіў задачы перад спецыялістамі гаспадаркі Аляксандр Іосіфавіч. За гады яго старшынства гаспадарка двойчы ўзбуйнялася і павялічылася ў пяць разоў. Калгас наладзіў цесныя сувязі з ВНУ, навукова-даследчымі інстытутамі, у ім выпрабоўваліся тэхналогіі апрацоўкі глебы, унясення арганічных і мінеральных угнаенняў, сродкаў абароны раслін. Ураджаі раслі з года ў год. Праз дзесяць год «Прагрэс» намалаціў 46 ц/га зерневых культур. У 1982 годзе Аляксандру Дубко прысвоілі званне Героя Сацыялістычнай Працы. Яго выбіралі дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР, СССР.

За 23 гады кіраўніцтва Дубко гаспадарка ператварылася ў шматгаліновае прадпрыемства, у якім не толькі выраблялася сельскагаспадарчая прадукцыя, а і ажыццяўлялася яе перапрацоўка.

**Кіраўнік вобласці**

У 1994 годзе абраны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка прапанаваў вопытнаму гаспадарніку пасаду старшыні Гродзенскага аблвыканкама. Кіраўніцкі талент Аляксандра Дубко дазволіў шмат зрабіць па вываду вобласці з крызісу. У старшыні аблвыканкама было многа планаў і задумак. Але пастаянная знясільваючая работа не магла не адбіцца на здароўі. 4 лютага 2001 года Аляксандр Дубко памёр. У знак прызнання заслуг Аляксандра Іосіфавіча Дубко перад дзяржавай і грамадствам 30 чэрвеня Указам Прэзідэнта краіны яму было пасмяротна прысвоена званне Героя Беларусі.

**Памяць. Спадчына**

Фундамент, закладзены Аляксандрам Дубко, дазволіў СВК «Прагрэс-Верцялішкі» заставацца да цяперашняга часу адным з вядучых прадпрыемстваў аграпрамысловага комплексу краіны. Вучань і паслядоўнік Аляксандра Дубко Васіль Рэвяка, які ўзначаліў гаспадарку, таксама стаў Героем Беларусі.

Імя Аляксандра Дубко носяць вуліцы ў Гродне і Верцялішках. Прэміі Гродзенскага аблвыканкама для творчай і вучнёўскай моладзі таксама носяць яго імя, як і міжнародныя спартыўныя турніры па хакеі і баскетболе, якія праводзяцца ў Гродне. Імя славутага земляка А. І. Дубко занесена на Алею Славы ў г. п. Шуміліна.

**Падрыхтаваў**
**Сяргей ЕРМАЛАЕЎ**